# Зямлі бацькоўскай прыцягненне



Да творчасці П. Труса далучыліся і члены тэатральнай студыі «Вітамін»

**У цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Труса адбылося літаратурна-музычнае свята «На сцежках светлай вясны», прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння паэта з Нізка.**

– Гэта свята не толькі Узды, раёна, але і ўсёй Беларусі, – адзначыў пазней паэт, пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» **Віктар Шніп**. – Паўлюк Трус пісаў свае вершы сто гадоў таму, а і сёння яны чытаюцца так, нібы напісаныя ўчора. У айчыннай літаратуры мала творцаў, якія па свайму таленту, майстэрству маглі б з ім параўнацца.

Гучыць песня пра родную зямлю на роднай мове, і ўсе без выключэння выступоўцы ёй карыстаюцца – а як інакш, калі адзначаюцца ўгодкі класіка беларускай літаратуры, чыё кароткае жыццё, творчасць з'яўляюцца гонарам нашай краіны.

Вершаваную пастаноўку пра жыццё Паўлюка Труса на словы **Віктара Сабалеўскага** паказалі прысутным удзельнікі тэатральнай студыі «Вітамін» Уздзенскай СШ №2 імя К. К. Крапівы пад кіраўніцтвам **Марыны Шыцікавай**. Нараджэнне паэта, яго дзяцінства, вучоба ва Уздзе, студэнцкія гады, літаратурная дзейнасць у сталіцы і пахаванне – усе этапы жыцця адлюстраваны ў пастаноўцы.

Цёплыя словы пра нашага земляка сказаў старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі **Леанід Крываноc**. Пражыў паэт мала, адзначыў ён, усяго 25 гадоў, пры жыцці выдаў дзве кніжкі, але на яго творах выхоўвалася не адно пакаленне, яго творчасць – прыклад для сучасных літаратараў, як трэба пісаць.

Пра тое, што робіцца для захавання спадчыны паэта, вяртання да шырокай грамадскасці яго рукапісаў, пісьмаў, пра сяброў, калег па літаратурнай групоўцы «Маладняк» у 20-я гады мінулага стагоддзя падрабязна расказалі пісьменніца, даследчыца творчасці П. Труса, ганаровы архівіст Рэспублікі Беларусь **Ганна Запартыка**, супрацоўніца Нацыянальнай бібліятэкі нашай краіны **Юлія Амосава**, абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна **Таццяна Лаўрык**, літаратуразнаўца **Аксана Данільчык**. Прысутныя даведаліся падрабязнасці з жыцця ўраджэнца Нізка, пра яго асяроддзе. Паўлюк Трус быў не толькі выдатным паэтам, але і добра маляваў, прыгожа спяваў, удзельнічаў у тэатральных пастаноўках, апрацоўваў музычныя творы. Сапраўды, неабсяжныя таленты! Можна ўявіць, што ён яшчэ мог бы зрабіць для Айчыны, калі б не заўчасная смерць.

І на Уздзеншчыне шмат робіцца для захавання памяці славутага земляка. Як прызналіся госці, у нашым раённым краязнаўчым музеі ёсць нямала рэчаў, якім і сталічныя ўстановы пазайздросцяць. У 1960 годзе раённай бібліятэцы прысвоена імя П. Труса, і ўвесь гэты час супрацоўнікі ўстановы, спачатку пад кіраўніцтвам **Клаўдзіі Рогавай**, а цяпер разам з **Аксанай Драчан** збіраюць, захоўваюць і выкарыстоўваюць у выхаваўчых мэтах усё, што звязана з яго іменем. У абласным конкурсе на стварэнне віртуальных рэсурсаў пра пісьменнікаў-землякоў сайт Уздзенскай бібліятэкі заняў прызавое месца, і ён пастаянна папаўняецца новымі фактамі, экспанатамі. І на свяце ў дар бібліятэцы перададзены некалькі адметных рэчаў. Выклікалі цікавасць у гасцей краязнаўчыя календары, якія штогод выдае **Аляксандр Нікітка**, а сёлетні быў прысвечны юбілею П. Труса.

Гучалі вершы нашага земляка і прысвечаныя яму. Прысутныя пaглядзелі відэаролік пра сённяшні Нізок, створаны ўнучатай пляменніцай паэта. Песня «Падаюць сняжынкі» на верш П. Труса і музыку **І. Лучанка** прагучала ў выкананні «Песняроў», а пра наш беларускі край хораша пелі артысты РДК.

**Сяргей ВАСІЛЬЧУК**
**Фота аўтара**